ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік начальніка ўпраўлення
адукацыі Магілёўскага
аблвыканкама
____________ А.У. Сцельмашок
“06” чэрвеня 2013 г.

*Дадатковае заданне*

| 1 варыянт | 2 варыянт |
|---|---|
| *1. Вызначце* | |
| стыль тэксту | тып тэксту |
| *2. Выберыце правільны адказ з прапанаваных* | |
| Складаным называецца сказ<br>*а) у склад якога, акрамя граматычнай асновы ўваходзяць даданыя члены сказа;*<br>*б) які складаецца з двюх або некалькіх граматычных частак, аб'яднаных у адно цэлае паводле сэнсу, інтанацыйна і граматычна;*<br>*в) які мае ўскладненую будову і многа знакаў прыпынку* | Паміж часткамі складаназлучанага сказа могуць ставіцца<br>*а) коска;*<br>*б) коска, кропка з коскай;*<br>*в) коска, кропка з коскай, працяжнік* |
| 3. ***Дайце сінтаксічную характарыстыку слова*** трывога *( з першага сказа трэцяга абзаца)* | 3. ***Дайце марфалагічную характарыстыку слова*** неўзабаве *( з першага сказа трэцяга абзаца)* |
| *4. Зрабіце сінтаксічны разбор* | |
| першага сказа з трэцяга абзаца | апошняга сказа тэксту |
| *5. Вызначце тэму тэксту* | *5. Вызначце галоўную думку тэксту* |

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік начальніка ўпраўлення
адукацыі Магілёўскага
аблвыканкама
____________ А.У. Сцельмашок
“06” чэрвеня 2013 г.

Заданні
для правядзення ўступных іспытаў у 10 клас ліцэя
па вучэбным прадмеце “Беларуская мова”

Дата правядзення – 15 чэрвеня 2013 года
Час выканання – 45 хв.

Дыктант з дадатковым заданнем

У 1912 годзе, у самым росквіце творчых сіл і прызнання ў мастацкім свеце, Бялыніцкі-Біруля піша сваю “Блакітную капліцу”.

На заснежаным пагорку сярод кволых дрэўцаў – бажніца. Ля купала сплывае маладзік. Па-над кромкаю снежных гурбаў праз хвіліну заяснее світанак. Сон за дзесяць хвілін да абуджэння...

Асноўнае – матыў прадчування, трывога за час, які мінае, смутак па нечым родным, што неўзабаве адыдзе ў нябыт. Ці можа падзяка за новы дзень, што неўзабаве наступіць? Але тое, што твор чалавечых рук роўны небу, - бясспрэчна.

Гэта палатно стала своеасаблівай візітоўкаю ўсёй спадчыны Бялыніцкага-Бірулі як найбольш адметны і шматзначны твор.

Твор, які быў напісаны па-за Беларуссю, стаў класікаю беларускай спадчыны, ад яго сёння вядуць радавод нацыянальнага беларускага жывапісу. *(Паводле С. Харэўскага)* ( 111 слоў)